

Мінчанін М. СЛІЗКІ, гарманіст і калекцыянер.

ТВОРЧАСЦЬ

# Грай, гармонік!

**Г. ШПАКОЎСКАЯ, фота М. ШМЕРЛІНГА, «НС».**

Аказваецца, у гарманістаў Беларусі ёсць свой гімн. Гучыць ён штогод на міжнародным фестывалі народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» у Паставах. Лепшым выканаўцам гімна прызнаны яго аўтар — мінчанін Міхаіл Слізкі, які напісаў і музыку, і тэкст.

**Грай, гармонік! Грай, гармонік!**
**Весялі людзей!**
**Хай душа твая гамоніць**
**З намі кожны дзень.**

Аматараў слухаць гэты папулярны народны інструмент і на Віцебшчыне шмат. Малыя, старыя — усе збіраюцца на канцэрты ў Паставах. Такая шчырая прыхільнасць натхняе музыкаў на выступленні і напісанне твораў.

Міхаіл Іванавіч не толькі выканаўца, а і калекцыянер гармонікаў. Самы першы падарыла яму ў дзяцінстве цётка. Хлапчук хутка навучыўся іграць. У вёсцы, дзе ён рос, было некалькі сапраўдных гарманістаў-віртуозаў. Бацька добра іграў на скрыпцы, маці спявала.

Зараз калекцыя Слізкага ўключае гармонікі вытворчасці шырока вядомых у былым Саюзе прадпрыемстваў — Шуйскай і Тульскай фабрык музычных інструментаў, а таксама выробленыя знанымі беларускімі майстрамі. Ёсць і экземпляры аўстрыйскага, нямецкага паходжання. Усяго некалькі дзесяткаў.

— Каб гармонік жыў, на ім трэба іграць, — гаворыць Міхаіл Іванавіч.

Рэпертуар у гэтага музыкі вельмі багаты, хоць для душы выбірае вальсы. І майстэрства не пазычаць. На сёлетнім пастаўскім фестывалі яму не было роўных.